100 1924-2024 ГАДОЎ

ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ ЧАСОПІС

# НАРОДНАЯ АСВЕТА

6
2024

Штомесячны навукова-педагагічны часопіс

# НАРОДНАЯ АСВЕТА

Выдаецца
з чэрвеня 1924 года

ЗАСНАВАЛЬНІК – МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
МАЗУРЫНА СВЯТЛАНА УЛАДЗІМІРАЎНА

| РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ | НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ |
| --- | --- |
| Бушная Н. У. | Башаркіна А. А. |
| Валатоўская В. А. | Гелясіна А. У. |
| Валюк А. У. | Казінец Л. А. |
| Жук Т. В. | Кароль А. Д. |
| Зубрыліна І. У. | Месніковіч С. А. |
| Іўчанкаў В. І. | Пальчык Г. У. |
| Казачонак В. У. | Смолік А. І. |
| Козел В. І. | Снапкова А. І. |
| Пашковіч Т. Ф. | Стуканаў В. Р. |
| Паючэнка І. Я. | Таранцей В. П. |
| Раманчык Н. В. | Хітрук В. В. |
| Сяргейка С. А. | Хрыптовіч В. А. |
| Шасцітка І. У. | Чарчэнка Н. У. |

Часопіс уключаны ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь
для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў

6/2024

# ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ


❖ «Народнай асвеце» – 100 гадоў ❖

**Віншавальны адрас міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А. І. Іванца** ... 3
**Мазурина С. В.** Журнал «Народная асвета»: 100 лет истории ... 4

❖ Навукова-метадычная платформа ❖

**Лазіцкі В. Л.** Межы і рызыкі лічбавай трансфармацыі ў сістэме адукацыі ... 7

❖ Універсітэт і школа: шлях да адкрыццяў ❖

**Король А. Д., Таяновская И. В.** Вопрошающая активность в контексте построения эвристического полилога ... 10

❖ Сацыяльна-псіхалагічная служба ❖

**Куницкая О. С., Гусакова М. В.** Цифровые девиации в подростковой среде ... 14

ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ «НАРОДНАЙ АСВЕТЫ» (пасяджэнне 172)

Метадычная работа ў школе: крокі да якасці

**Гелясина Е. В.** Качество методической работы в школе: сущность и индикаторы ... 19
**Ясюкевич Е. М., Царева С. П.** Педагогический совет «Современный урок – основа качественного образования» ... 23
**Рапинчук И. А.** Педсовет-квест «Функциональная грамотность: от теории к практике» ... 26
**Рачевский С. Г., Матыцина И. Г.** Проблемный семинар: в поиске обоснованного педагогического решения ... 30
**Казак Е. В.** Методический митап «SEL 4.0: как работать с эмоциями» ... 33
**Ипатьева В. Ф.** Педагогическая лаборатория «Функциональная грамотность – основа успешного учения» ... 38
**Маковей Н. В.** Исследовательская деятельность школьников: семинар-практикум (www.n-asveta.by/dadatki/asambleya/2024/n06/makovej.pdf)

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ «ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ» (выпуск 208)

Сярэдняя школа № 31 г. Брэста

**Бортновская И. А., Герасевич И. Ф., Жулего С. А., Мельникова О. М., Коновчук С. П.** «Радость, общение, доверие, надежда и комфорт!» ... 42

❑ **Вучэбна-метадычны кластар**

**Жулего С. А.** Семинар-практикум «Как реализовать воспитательный потенциал урока» ... 46
**Хількові А. І.** Майстар-клас «Эфектыўныя прыёмы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў» ... 50
**Левченко Л. И.** Ролевая игра на уроках английского ... 53
**Костюкова Н. В.** Познание мира – через мотивацию к изучению физики ... 56
**Яромская Л. Е.** Урок истории: формируем у детей исследовательскую компетенцию ... 59
**Антипорук Н. А.** Творческие уроки литературного чтения (www.n-asveta.by/dadatki/eshb/2024/n06/antiporuk.pdf)
**Калишук Е. П.** Реализация воспитательного потенциала на учебных занятиях по биологии (www.n-asveta.by/dadatki/eshb/2024/n06/kalishuk.pdf)

❑ **Выхаваўчая платформа**

**Петух И. В.** Проект «ШАГ»: час общения «У природы есть друзья – ты и я!» ... 63
**Герасевич И. Ф., Мачинская Е. Г., Бычик А. В.** Творческо-игровой проект «На всех парусах!»: модель организации смены летнего лагеря ... 67
**Коновчук С. П., Костюкова Н. В., Хмарук Н. И.** Квест «Любимая страна» (www.n-asveta.by/dadatki/eshb/2024/n06/kvest.pdf)

❖ Кафедра выхавання: да 80-годдзя вызвалення Беларусі ❖

**Філанюк А. А.** Інтэлектуальна-пазнавальная гульня «Вялікаму подзвігу прысвячаецца» ... 71
**Будницкая Е. А.** Патриотический квест «Символ Победы» ... 74
**Пуня И. Н.** Интерактивная игра «Патриот» ... 77
**Павлова Н. М.** Час памяти «Знаю. Помню. Горжусь» ... 78
**Назарова Н. И.** Праздничная программа «Нам в 43-м выдали медали и только в 45-м паспорта» (www.n-asveta.by/dadatki/eshb/2024/n06/nazarova.pdf)
**Ткаченок Ю. В.** «Есть память, которой не будет конца...»: Дню Победы посвящается! (www.n-asveta.by/dadatki/eshb/2024/n06/tkachenok.pdf)

ІНТЭРАКТЫЎНЫ ПРАЕКТ «БАЦЬКОЎСКІ СХОД» (выпуск 163)

**Месникович С. А.** Формирование у старшеклассников психологической готовности к семейной жизни ... 80
**Пискун Е. П.** Час общения «Семья и традиционные ценности» ... 84
**Богатко О. В.** Занятие для подростков «Любовь и влюбленность» ... 87

❖ Часопіс «Народная асвета»: 100 гадоў гісторыі ❖

«Чуйнасць неабходна педагогу ўсюды і заўсёды»: рэтраспектыўны агляд артыкулаў ... 90

# МЕЖЫ І РЫЗЫКІ ЛІЧБАВАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ Ў СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ

## Псіхолага-педагагічны аспект прэдыктыўнага аналізу



**В. Л. Лазіцкі,**
дацэнт кафедры эканомікі і бізнесу Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Дынамічныя змены ў жыцці грамадства адлюстроўваюцца ў ліку іншага і ў тэхналагізацыі адукацыйнай сферы, што актуалізуе вывучэнне праблематыкі лічбавай трансфармацыі ў сістэме адукацыі. Асэнсаванне педагогамі сутнасці лічбавізацыі, тэндэнцый, перспектыў і абмежаванняў яе развіцця ў адукацыйнай сферы з'яўляецца важнай умовай эфектыўнай арганізацыі адукацыйнага працэсу, трывалага замацавання адной з прыкмет сфарміраванасці інфармацыйнай культуры асобы. Без сістэмнага ўяўлення і ўзважанага ацэньвання шматаспектнасці, неадназначнасці і супярэчлівасці сацыяльных і тэхнагенных выклікаў, рызык і пагроз нельга аб'ектыўна вызначаць кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя перспектывы развіцця працэсаў лічбавай трансфармацыі ў адукацыі. Нягледзячы на наяўнасць навуковых даследаванняў па дадзенай праблематыцы [2–8], па-за ўвагай застаецца псіхолага-педагагічны аспект вывучэння меж і пагроз лічбавізацыі адукацыйнай сферы з пазіцый прэдыктыўнага аналізу.**

Прэдыктыўны аналіз як метад прагнастычнага даследавання працэсуальнага развіцця заснаваны на аналізе сістэматызаваных даных (параметраў) у сукупнасці з іх інтэрпрэтацыяй. Пры выкарыстанні метаду трэба ўлічваць дэтэрмінанты – фактары (умовы), якія абумоўліваюць тэмпы і своеасаблівасць працэсаў лічбавізацыі. Да такіх дэтэрмінуючых фактараў неабходна аднесці наступныя:

- дынамізм сацыякультурных змен, абумоўленых інтэграцыяй інавацыйных ІКТ у жыццё грамадства;
- змяненне характару інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы і фарміраванне новых умоў вырашэння задач, якія паўстаюць перад адукацыйнай сферай;
- прад'яўленне рынкам працы новых патрабаванняў да кампетэнцый спецыяліста – удзельніка высокатэхналагічнай вытворчасці эпохі чацвёртай прамысловай рэвалюцыі (у тым ліку ў галіне адукацыі);
- развіццё тэарэтыка-метадалагічных падыходаў да абгрунтавання інавацыйных практыка-арыентаваных адукацыйных мадэлей, якія забяспечваюць узаемадзеянне навукі, адукацыі, вытворчасці, прадпрымальніцтва і бізнесу;
- удасканаленне нарматыўнай прававой базы з мэтай рэгулявання працэсаў лічбавай трансфармацыі ў адукацыйнай сферы;
- развіццё педагагічнай практыкі і вопыту забеспячэння пераемнасці ўзроўняў адукацыі ва ўмовах лічбавізацыі;
- укараненне дыстанцыйных форм арганізацыі адукацыйнага працэсу;
- развіццё сеткавай мадэлі трансляцыі вучэбнай інфармацыі ў рамках інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы.

Тэрмін *рызыкі лічбавай трансфармацыі* вызначаецца намі як сукупнасць нявызначанасцей (падзей ці ўмоў), вынікам узнікнення якіх з'яўляецца пазітыўны ці негатыўны ўплыў на працэс лічбавізацыі. У межах навуковага прагназавання можна вызначыць наступныя рызыкі лічбавай трансфармацыі:

- негатыўнае тэхнатроннае ўздзеянне на кагнітыўныя функцыі суб'ектаў адукацыйнай дзейнасці;

- страта непасрэдных жывых зносін – найважнейшай умовы засваення сацыяльнага вопыту;
- немагчымасць кантраляваць уплыў вынікаў выкарыстання штучнага інтэлекту ў адукацыйнай дзейнасці;
- узрастанне няроўнасці ў доступе да інавацыйных ІКТ («лічбавы разрыў») і асінхроннасці тэмпаў развіцця інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы ў параўнанні з дынамікай развіцця інфармацыйных кампетэнцый у суб'ектаў адукацыйнай дзейнасці [5];
- страта інфармацыі (у тым ліку персанальных даных) у выніку кібератак, злачынных дзеянняў;
- пашырэнне выкарыстання ІКТ пры выкананні вучэбных заданняў з мэтай акадэмічных фальсіфікацый (плагіят, спісванне, падказкі).

Разуменне рызык і меж лічбавізацыі ў адукацыйнай сферы неабходна для прадухілення няправільнага ацэньвання інфармацыйна-камунікацыйнай рэальнасці, для ўтрымання кантролю над ёй. На гэту праблему ва ўзаемасувязі з развіццём працэсаў лічбавізацыі адукацыі і выкананнем дзяржаўных праграм у кантэксце прыярытэтаў Дарожнай карты па рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь звяртае ўвагу І. У. Зубрыліна [4, с. 8–10].

Актуальнай застаецца распрацоўка комплексу пытанняў, звязаных з павышэннем эфектыўнасці Е-дыдактыкі і яе дыдактычным забеспячэннем ва ўмовах дасягнення пераемнасці на сістэмных узроўнях бесперапыннай адукацыі. Востра запатрабаваны аналіз кагнітыўных рызык, якія праяўляюцца ў працэсе лічбавай трансфармацыі адукацыйнай сферы (інфармацыйнае перанасычэнне кагнітыўнай сферы; дэвальвацыя магчымасцей механізмаў памяці; зніжэнне ўзроўню крытычнага мыслення, здольнасці да самастойнага стварэння інтэлектуальнага прадукту; тэхналагізацыя дэвіянтных паводзін). Вырашэння патрабуюць пытанні інфармацыйна-псіхалагічнай бяспекі актараў адукацыйнай дзейнасці (вучняў і настаўнікаў) ва ўмовах інтэграцыі інавацыйных ІКТ у навучанне.

Вызначэнне пагроз і рызык лічбавай трансфармацыі ў адукацыі дазваляе асэнсоўваць межы і перспектывы яе развіцця з дапамогай прэдыктыўнай аналітыкі, грунтоўнымі палажэннямі якой з'яўляюцца:

- улік тэндэнцый і фактараў, якія абумоўліваюць развіццё сферы адукацыі ва ўмовах лічбавізацыі і станаўлення ІТ-грамадства;
- распрацаванасць тэарэтыка-метадалагічных падыходаў, якія вызначаюць працэсы развіцця лічбавізацыі адукацыі;
- абагульненне прамежкавых і канчатковых вынікаў рэалізацыі палажэнняў Канцэпцыі лічбавай трансфармацыі працэсаў у сістэме адукацыі Рэспублікі Беларусь на 2019–2025 гады з улікам прыярытэтаў Дарожнай карты па рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця;
- прававая забяспечанасць лічбавай трансфармацыі ў сферы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь;
- даступнасць рэсурснага вучэбна-метадычнага забеспячэння лічбавай трансфармацыі ў сукупнасці з разуменнем рызык тэхналагізацыі навучання, а таксама абмежаванняў, звязаных з чалавечым фактарам і псіхолага-педагагічнымі асаблівасцямі адукацыйнай дзейнасці саміх актараў – настаўнікаў і вучняў.

Пад тэрмінам *межы лічбавай трансфармацыі* ў адносінах да сферы адукацыі мы разумеем крытычныя межы (абмежаванні) працэсуальнага развіцця, прыкметамі парушэння якіх з'яўляюцца антыгуманістычная накіраванасць тэхналагізацыі; рэгрэсіўнае парушэнне ўнутраных і знешніх сувязей адукацыі і, як вынік, зніжэнне эфектыўнасці; адсутнасць аптымізацыі выдаткаў і страта эфектыўнасці пры недастатковасці (ці адсутнасці) рэсурсаў развіцця ў межах працэсаў лічбавізацыі; агульнае невыкананне канцэптуальных прынцыпаў педагогікі.

Вызначэнне меж лічбавай трансфармацыі працэсаў у сістэме адукацыі павінна абапірацца на дакладнае разуменне глыбіні развіцця лічбавізацыі, яе мэты і перспектыў. Іншымі словамі, гаворка ідзе пра тое, як далёка неабходна прайсці грамадству ў развіцці працэсаў лічбавізацыі, каб зрабіць адукацыйную сферу і суб'ектаў адукацыйнай дзейнасці яшчэ больш канкурэнтаздольнымі, а дзе трэба спыніцца для прадухілення цывілізацыйных сацыяльных пагроз (як мінімум, нерэнтабельнасці рэсурсных укладанняў у лічбавую трансфармацыю працэсаў у сістэме адукацыі).

## Рэзюмэ аўтара

Важнай умовай мінімізацыі рызык і пераадолення вузлавых праблем лічбавай трансфармацыі ў адукацыйнай сферы з'яўляецца ўлік імператыўных патрабаванняў, выкананне якіх спрыяе забеспячэнню пераемнасці агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Да такіх імператываў неабходна аднесці наступныя:

функцыянальная дасведчанасць і інфармацыйная культура суб'ектаў педагагічнага ўзаемадзеяння, арыентаваных на пастаяннае самаразвіццё і ўдасканаленне прафесійных патрабаванняў да сябе, сваёй дзейнасці і яе вынікаў; накіраванасць на распрацоўку і прымяненне эфектыўных мадэлей арганізацыі адукацыйнага працэсу, пераадоленне аб'ектыўных супярэчнасцей ва ўмовах тэхналагізацыі адукацыйнага працэсу; прымяненне адаптаваных да асаблівасцей інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы і адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі форм, метадаў і высокатэхналагічных сродкаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці; мэтанакіраванасць і дынамічнасць педагагічнай дзейнасці, яе паступальна-ўзыходзячы характар; суб'ект-суб'ектныя канструктыўныя адносіны актараў педагагічнага ўзаемадзеяння.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Концепция цифровой трансформации процессов в системе образования Республики Беларусь на 2019–2025 годы**, утв. Министром образования Респ. Беларусь 15.03.2019 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://drive.google.com/file/d/1T0v7iQqQ9ZoxO2IlwR_OlhqZ3rjKVqY-/view. – Дата доступа: 10.02.2024.
2. **Богуш, В. А.** Цифровизация образования: проблемы, вызовы и перспективы / В. А. Богуш, Е. Н. Шнейдеров // Адукацыя і выхаванне. – 2021. – № 1. – С. 14–21.
3. **Бутина, Е. А.** Цифровизация образовательного пространства: риски и перспективы / Е. А. Бутина // Профессиональное образование в современном мире. – 2020. – Т. 10. – № 2. – С. 3695–3701.
4. **Зубрилина, И. В.** Цифровизация образования в контексте приоритетов Дорожной карты по реализации ЦУР в Республике Беларусь / И. В. Зубрилина // Адукацыя і выхаванне. – 2023. – № 8. – С. 11–19.
5. **Лозицкий, В. Л.** Преодоление ситуации функционально-деятельностного разрыва у субъектов учебной деятельности в условиях цифровизации образования / В. Л. Лозицкий // Адукацыя і выхаванне. – 2023. – № 9. – С. 30–37.
6. **Маниковская, М. А.** Цифровизация образования: вызовы традиционным нормам и принципам морали / М. А. Маниковская // Власть и управление на Востоке России. – 2019. – № 2 (87). – С. 100–106.
7. **Черных, С. И.** Цифровизация образования как дизруптивная инновация / С. И. Черных // Проблемы высшего образования и современные тенденции социогуманитарного знания (VIII Арсентьевские чтения): материалы Всерос. науч. конф. с междунар. участием, Чебоксары, 17–18 декабря 2019 г. – Чебоксары: ИД «Среда», 2020. – С. 254–258.
8. **Храпов, С. А.** Философия рисков цифровизации образования: когнитивные риски и пути создания безопасной коммуникативно-образовательной среды / С. А. Храпов, Л. В. Баева // Вопросы философии. – 2021. – № 4. – С. 17–26.


**УДК 378:37.012.2**


*У артыкуле разглядаюцца актуальныя пытанні ажыццяўлення працэсаў лічбавізацыі адукацыі з улікам імклівай тэхналагізацыі інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы ва ўмовах фарміравання ў Рэспубліцы Беларусь IT-грамадства. З пазіцый педагагічнай навукі і прэдыктыўнага аналізу аўтарам асэнсоўваюцца межы лічбавай трансфармацыі ў адукацыйнай сферы, тэндэнцыі яе развіцця. Вызначаны дэтэрмінуючыя фактары інтэграцыі інавацыйных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у адукацыю, праблемныя аспекты іх выкарыстання. Аўтарам сфармуляваны імператывы, улік якіх ва ўмовах лічбавізацыі дазволіць пераадолець пагрозы тэхагеннага і сацыяпрыроднага характару, дасягнуць забеспячэння пераемнасці на ўсіх узроўнях адукацыі. Артыкул будзе карысны пры падрыхтоўцы матэрыялаў для арганізацыі прафесійнага самаразвіцця педагогаў, ажыццяўлення даследчай дзейнасці.*

*The article discusses the current problems of implementing the processes of digitalization of education, taking into account the dynamics of the rapid technologization of the information and communication space in the formation of the IT society in the Republic of Belarus. From the standpoint of pedagogical science and predictive analysis, the author comprehends the limits of digital transformation in the educational sphere, the trends of its development. The determinants of the integration of innovative information and communication technologies into education, problematic aspects of their use are highlighted. The author formulates imperatives, the consideration of which in the conditions of digitalization will make it possible to overcome the threats of of a technogenic and sociological nature and achieve the necessary efficiency of ensuring continuity at all levels of education. The proposed material will be useful for the practical work of teachers when preparing for the professional self-development and conducting research activities.*